*М.В. Абабурка (Магілёў)*

# СЭНСААДРОЗНІВАЛЬНАЯ І СЮЖЭТНА-ТЭМАТЫЧНАЯ ФУНКЦЫЯ НЕКАТОРЫХ ПАЎТОРАЎ У ПАЭЗІІ А.КУЛЯШОВА

Разнастайныя паўторы як спосабы арганізацыі вершаванага маўлення і паэзіі ўласцівыя ўсім творам А.Куляшова без выключэння. Гэта ў першую чаргу рытмастваральныя, гукавыя, лексіка-стылістычныя, кампазіцыйныя паўторы. Нашу ўвагу прыцягнулі такія паўторы ў вершах і паэмах А.Куляшова, якія значную дапамогу аказваюць рэцыпіенту ва ўспрыманні і разуменні як літаратурна-мастацкага тэксту, так і куляшоўскага вобразаўтварэння, арыгінальнага паэтычнага мыслення.

Ужо на самым пачатку сваёй творчай дзейнасці, будучы ў 13-гадовым узросце, А.Куляшоў дэманструе прыклады высокапрафесійнай працы з кампазіцыйнымі паўторамі. Вось як пачынаецца адзін з безымянных вершаў таго часу:

*Радасна і сумна шалясцяць асіны –*
*Гоман жаўталісця я пачуў у іх,*
*І нітуюць неба струны-павуціны*
*Ў сонечных праменнях чыстых, залатых.*

Канцоўка ж гэтага твора такая:

*Радасна і сумна шалясцяць асіны,*
*Радасна і сумна шалясцяць дубы.*
*У кляновых лісцях віснуць павуціны,*
*У срабрыстых ніцях жоўтыя сады.* [1]

Нават калі б паэт пакінуў нам толькі працытаваныя строфы, твор атрымаўся б высокапаэтычны, з арыгінальным успрыняццем восені і перадачай яго не толькі пры дапамозе так званага абрамлення.



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

У розных творах А.Куляшова пастаянна паўтараюцца словы-вобразы, што маюць алегарычны ці сімвалічны сэнс. Найперш гэта лексемы, якія абазначаюць назвы прадметаў ці з'яў, звязаных з штодзённым жыццём і побытам самога паэта, увогуле чалавека, асабліва селяніна: *хата, дом, поле, хлеб, жыта, снапы, шлях, дарога, вада, рака, мора, сонца, хмары, зоркі, лес, бор, дуб, клён, сасна, бяроза* і шмат іншых. Недарэмна такога роду і ліку словы ўвайшлі ў загалоўкі або асобных твораў, або цэлага цыклу іх, або нават зборнікаў А.Куляшова. Дачка паэта – В.Куляшова [2] у сваім літаратуразнаўчым эсэ "Лясному рэху праўду раскажу..." расшыфравала (дэкадзіравала) некаторыя бацькавы намінацыі накшталт наступных: "бор, лес – малая радзіма", "вяршыні баравыя – гэта людзі, лепшыя з іх", "лясны арган – народ", "лясному рэху – народу свайму" і г.д.

Больш канкрэтную, можна сказаць, нацыянальна-дакументальную, інфармацыю перадаюць паўторныя геаграфічныя і антрапанімічныя назвы тыпу *Магілёў, Орша, Камунары, Хоцімск, Дняпро, Бесядзь, Сож, Сымон, Васіль, Мікола, Алесь, Агата, Зося, Алеся*... Каханне студэнта (юнака) да дзяўчыны Алесі (Зосі) "пранізвае" такія творы паэта, як "З дзённіка брыгадзіра", "Новае рэчышча", "Толькі ўперад", "Далёка да акіяна" і іншыя, дзе, паводле сведчання В.Куляшовай [3], адлюстравалася паэтава ("бацькава") каханне да настаўніцы А.В.Карыткінай.

"Дзённікі, "лісты", "размовы", "аповесці", "словы", "балады" з'яўляюцца як самастойнымі творамі, так і састаўнымі часткамі іх з абавязковым ужываннем гэтых намінацый і пры абазначэнні жанраў маўлення (пісмовага ці вуснага). Дзеля пацвярджэння сказанага параўнаем толькі верш "З дзённіка брыгадзіра" і паэму "Сцяг брыгады", напісаную ў форме "дзённіка"; "ліст" з "Песні лістаносца" і "Ліст з палону"; верш "Размова з патомкамі" і нібыта "размову" рэк з берагамі, паэта з "ваякамі", "зямлёю" і г.д. з паэмы "Хлопцы апошняй вайны" і ўбачым, што ў названых творах ключавыя словы, пачынаючы ад загалоўка, паступова набываюць глыбінны сэнс не толькі ў самім тэксце, але і ў ягоным падтэксце.

Паўторы тыпу "*бо я нежывая*", "Крычу яму, *клікаю, клікаю*...", "*Што за людзі*?" і інш. ("Сцяг брыгады"), "*Трэба ўперад ісці, Толькі ўперад ісці*!" ("Толькі ўперад") "*Вось і ўсё*", "*Суд ідзе*", "*Далёкі ўсход*", ваяўнічыя "*Захад і Усход*", "*ручы для дабра*", "*заарэ межы ўсе*" і інш. ("Грозная пушча"), "*Няма, не можа быць і не было*" ("Цунамі") і г.д. выконваюць ролю тых мастацкіх дэталей, якія непасрэдна ці пачынаюць, ці рухаюць, ці завяршаюць сюжэтныя лініі ў паэтычным творы.



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

## Літаратура

1. Усе прыклады-ілюстрацыі ўзятыя з выдання: ***Аркадзь Куляшоў.*** Збор твораў у чатырох тамах. – Мн.: Беларусь, 1966 – 1967.

2. ***Куляшова В.*** Лясному рэху праўду раскажу... – Мн.: Маст. літ., 1989. – С. 259 – 261.

3. Тамсама. – С. 112 – 119.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова